УДК 75.046.3.034.7(476) + 821.161.3.09-1(091)“17”

# АЛЕГАРЫЧНЫ СЮЖЭТ “ТАНЕЦ СМЕРЦІ” Ў ІКАНАПІСЕ І ПАЭЗІІ БЕЛАРУСІ ЭПОХІ БАРОКА

**Кісялёва Лія Генадзьеўна**
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)

*У артыкуле разглядаюцца абраз з гродзенскага кляштара брыгітак і кніга паэзіі Ю. Бакі “Заўвагі непазбежнай смерці”. У гэтых творах надзвычай сама-*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

*бытна інтэрпрэтуецца вядомы з Сярэднявечча алегарычны сюжэт “Танец смерці”.*

Алегарычны сюжэт “Танец смерці” (“Danse macabre”) набыў папулярнасць у еўрапейскай культуры з XIV ст. – прычым спачатку ў літаратуры, а пасля ў выяўленчым мастацтве. У найбольш ранніх вядомых тэкстах танец смерці абвяшчаецца “высакароднай дактрынай” завяршэння зямнога жыцця. Сцвярджаецца ідэя, што смерць ураўноўвае ўсіх: усе – ад самых вялікіх да мізэрных – аднойчы будуць танчыць аднолькавы танец. У сярэднявечных паэмах выбудоўваліся іерархіі “танцораў”, пачынаючы ад Папы і імператара і заканчваючы земляробам, дзіцём, пустэльнікам, жабраком і г. д. Колькасць персанажаў вагалася ад 24 да 40 і больш. З’явіўшыся ў Францыі, сюжэт ужо ў XV ст. захапіў фактычна ўсе еўрапейскія краіны. Ён бясконца тыражаваўся ў брашурах, дзе друкаваліся паэмы з ілюстрацыямі, пашыраўся ў выглядзе паасобных гравюр – таксама часта з суправаджальнымі вершамі і г. д.

У Рэчы Паспалітай падобныя гравюры набылі асаблівую папулярнасць у эпоху барока. Акрамя таго, як і ў некаторых іншых краінах Еўропы, “Танец смерці” станавіўся тут сюжэтам для касцёльнага жывапісу. У Польшчы захавалася некалькі падобных абразоў эпохі барока, найбольш вядомыя з іх знаходзяцца ў касцёле бернардынаў у Кракаве, у базіліцы Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі ў Вэнграве, у санктуарыі Маці Божай Кальварыйскай у сяле Кальварыя Пацлаўска. У Беларусі таксама ёсць такі ўзор – гэта абраз з гродзенскага кляштара брыгітак.

Абразы “Танец смерці”, створаныя ў XVII–XVIII стст. у Рэчы Паспалітай, адхіляюцца ад іканаграфічнага канона, які для гэтага сюжэта быў выпрацаваны з часоў Сярэднявечча. У іншых еўрапейскіх краінах “Danse macabre” часцей за ўсё ўвасабляўся ў лінейных шматфігурных кампазіцыях, расцягнутых па гарызанталі на дзясяткі метраў. На абразах ці фрэсках разгортвалася выява працэсіі, у якой рухаліся папарна са шкілетамі персанажы, якія сімвалізавалі ўсе прыступкі сацыяльнай іерархіі. У Рэчы Паспалітай жа склаўся ўласны адметны канон “Танца смерці”, паводле якога напісаны ўсе вышэйпералічаныя абразы і ўзорам для якога, на думку даследчыкаў, стала адна з гравюр нямецкага мастака XVII ст. Паўля Фюрста. Усе гэтыя абразы складаюцца з вялікай цэнтральнай выявы, па перыметры якой размяшчаюцца меншыя кампазіцыі – медальёны ці клеймы акруглай або прастакутнай формы. Цэнтральная карціна на ўсіх абразах, якія знаходзяцца на тэрыторыі Польшчы, – агульны танец людзей розных саслоўяў уперамешку са шкілетамі. У маленькіх выявах асноўны сюжэт дэталізуецца: кожная катэгорыя людзей разглядаецца асобна. Усе выявы суправаджаюцца вершаванымі подпісамі: асобнае чатырохрадкоўе звернута да кожнага вылучанага слоя грамадства і два катрэны – абагульняльныя. Дзеля прыкладу працытую ўступны абагульняльны верш: “Rożnych Stanów piękne grono / Gęstą Śmiercią przepleciono / Żyjąc wszystko tańcujemy / A że obok Śmierć nie wiemy” [1, с. 44].

Колькасць медальёнаў – выяў асобных слаёў грамадства – на ўсіх абразах аднолькавая: іх 14. Па вялікім рахунку, тут выбудоўваецца прыблізна такая ж іерархія, як у большасці вядомых у Еўропе “Танцаў смерці”, – толькі з меншай колькасцю персанажаў. Тут прадстаўлены: 1) Папа Рымскі; 2) Імператар;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) Кароль; 4) Кардынал; 5) Біскуп; 6) Ксяндзы і манахі; 7) Князь; 8) Сенатар; 9) Шляхціц; 10) Мешчанін (гандляр); 11) Селянін; 12) Жаўнер і жабрак; 13) Іншаверцы (на абразах намаляваны туркі і яўрэі, г. зн. мусульмане і іўдзеі); 14) Блазан і дзіцёнак.

Усе абразы "Танец смерці", якія знаходзяцца на тэрыторыі Польшчы, збольшага падобныя адзін да аднаго, а гродзенскі заўважна адрозніваецца ад іх. Сярэдзінная частка ў яго складаецца з трох самастойных карцінак: акрамя ўласна танцу, тут ёсць выява пачвары, якая вывяргае з пашчы полымя (сімвал пекла), і самы вялікі малюнак – гратэскная кампазіцыя, у цэнтры якой сцэна д'ябальскай "рыбалкі" – нячысцікі ловяць людзей, што боўтаюцца ў вадзе, вудамі, на якія начэплены папская тыяра, кароны і іншыя атрыбуты ўлады. Гродзенскі абраз мае і яшчэ адно адрозненне ад астатніх: жаўнера і жабрака тут няма, а замест іх фігуруе дама. Адпаведна, для гэтай выявы складзены новы вершаваны подпіс, якога няма на іншых абразах. Гэтыя і некаторыя іншыя адметнасці трапна адзначаюцца ў артыкуле Н. Сліж, дзе гродзенскі абраз параўноўваецца з кракаўскім [1]. Можна толькі дадаць, што ён адрозніваецца і ад астатніх падобных абразоў (з Вэнграва і Кальварыі Пацлаўскай), г. зн. у цэлым адхіляецца ад пэўнага іканапіснага "стандарту", які для сюжэта "Танец смерці" быў сфармаваны ў Рэчы Паспалітай.

"Danse macabre" знайшоў увасабленне і ў паэзіі Беларусі XVIII ст. – у творчасці Юзафа Бакі, святара, прапаведніка, заснавальніка езуіцкай місіі ў маёнтку Блонь на Міншчыне. У 1766 г. ён выдаў у Вільні кнігу "Заўвагі непазбежнай смерці" ("Uwagi śmierci niechybnej"), дзе сцвярджаліся ідэі марнасці чалавечага існавання і абсалютнай роўнасці ўсіх людзей, незалежна ад ладу жыцця, заслуг, тытулаў, багаццяў і нават узросту, перад уладай смерці. Гэтыя экзістэнцыйныя ісціны Ю. Бака выклаў зусім не ўрачыста, не велічна, а ў даволі нечаканай форме, можна сказаць, досыць бадзёрых куплетаў, напісаных адборным прастамоўем.

"Заўвагі непазбежнай смерці" складаюцца з 22 тэкстаў – 1 празаічнага і 21 вершаванага. Цікава адзначыць, што большасць паэтычных тэкстаў з гэтай кнігі напісаныя катрэнамі, дзе першыя два радкі маюць вершаваны памер, які фактычна супадае з рытмікай рыфмаваных подпісаў на вышэйразгледжаных абразах. Асноўная частка кнігі – 14 вершаў рознай велічыні (ад 8 да 25 чатырохрадкоўяў), адрасаваных асобным катэгорыям людзей, якім паэт хоча нагадаць пра непазбежнасць смерці. Як бачым, колькасць вылучаных катэгорый у Ю. Бакі і ў аўтараў абразоў аднолькавая, але самі класіфікацыі ў паэта і мастакоў супадаюць толькі часткова. Пералічу вершы ў тым парадку, як яны надрукаваны ў кнізе: "Заўвага старым", "Маладым заўвага", "Цёмным багачам асвета", "Заўвага панам", "Заўвага дамам", "Заўвага рыцарам", "Духоўным", "Дворскай моладзі", "Патрыётам Кароны Польскай і ВКЛ", "Чужаземцам", "Панам дысідэнтам" (маюцца на ўвазе пратэстанты), "Жыхарам горада", "Убогім сялянам", "Заўвага вясёлым ці занятым хмелем галовам".

У адрозненне ад аўтараў абразоў, Ю. Бака ў сваёй "класіфікацыі" ўсіх смяротных не прытрымліваецца строга ні іерархічных прынцыпаў, ні агульнаеўрапейскіх традыцый. Відавочна, што ўладары – духоўныя і дзяржаўныя, кардыналы і каралі – яго мала турбуюць. Ён у сваіх "Заўвагах" звяртаецца да тых, з кім хоча і можа размаўляць на роўных. Гэтаксама відавочна, што Ю. Баку не хвалююць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ні мусульмане, ні іўдзеі: напэўна, ён лічыць, што ў іх свае рахункі з небам. У паэта-езуіта няма пытанняў ні да туркаў, ні да яўрэяў (якія фігуруюць на абразах), а вось да немцаў, французаў, італьянцаў (да якіх ён звяртаецца ў вершы "Чужаземцам") і да сваіх, тутэйшых пратэстантаў (з верша "Панам дысідэнтам") пытанні якраз-такі ёсць. Аднак у любым выпадку Ю. Бака артыкулюе тую самую ідэю, якая закладзена ў сюжэце "Танец смерці": не важна, кім ты ёсць, – канец ва ўсіх аднолькавы.

Такім чынам, у эпоху барока ў іканапісе і асабліва ў паэзіі Беларусі папулярны алегарычны сюжэт пераасэнсоўваўся і набываў самабытныя формы.

## Літаратура

1. Sliz, N. Obraz *Taniec smierci* w Grodnie jako zrodło wizualne i literackie / N. Sliz // Zescyty Historyczne. Prace Naukowe Akademii im. Jana Długosza / pod. red. A. Stroynowskiego. – 2015. – T. XIV. – S. 27–50.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова